

ЯКОЙ ПАВІННА БЫЦЬ ЭКАЛАГІЧНАЯ АСВЕТА? 7

НЕВЯДОМЫ ФЕЛЬЕТОН ПАЭТА ВЯЛЮГІНА 10



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 ЛЮТАГА 2024 г. АЎТОРАК № 30 (30164)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Руслан ПАРХАМОВІЧ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:**

*«У мінулым годзе будаўнічая галіна заняла месца ў ліку асноўных драйвераў росту нацыянальнай эканомікі краіны разам з гандлем і апрацоўчай прамысловасцю. Выканана большасць даведзеных урадам заданняў. Па выніках 2023 года будаўнікі занялі другое месца па прыросце валавой дабаўленай вартасці, што дало магчымасць забяспечыць дадатны ўклад у ВУП краіны. Доля будаўніцтва ў ВУП Беларусі склала 5,1 %».*

# З МІКРАСКАПІЧНАЙ ДАКЛАДНАСЦЮ



Фота БелТА.

Навуковы супрацоўнік БДУІР Ганна БАНДАРЭНКА 20 гадоў свайго жыцця прысвяціла распрацоўцы тэхналогій фарміравання нанаструктур на аснове металаў і паўправаднікоў. З іх дапамогаю ўдасканальваюцца існуючыя і ствараюцца радыкальна новыя мікраэлектрамеханічныя сістэмы, вырабы медыцынскага прызначэння і высокаадчувальныя фатонныя сэнсары. А нядаўна Ганна Віталеўна атрымала з рук Прэзідэнта дыплом доктара тэхнічных навук.

## КОРАТКА

- **Сальда знешняга гандлю Беларусі па выніках 2023 года склалася дадатным у памеры $480,7 млн.**



- Натарыусы Мінскай вобласці 15 лютага арганізуюць бясплатныя кансультацыі для воінаў-інтэрнацыяналістаў.
- **Дзень адчыненых дзвярэй на ваенным факультэце БДУІР пройдзе 17 лютага.**
- Білеты на «Славянскі базар у Віцебску» пачнуць прадаваць 16 лютага.



ISSN 1990 — 763X

Сацыяльны аспект

## «...у цямніцы быў, і вы прыйшлі да Мяне»

**Духоўная адукацыя для асуджаных — новы сумесны праект МУС і Праваслаўнай царквы**

**У кастрычніку 2022 года ў сістэме Дэпартамента выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі стартаваў праект «Праваслаўе ў дапамогу тым, хто пакутуе», які даў магчымасць атрымання духоўнай адукацыі людзям, што знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі. З восені 2023 года праект атрымаў развіццё. Яго ініцыятарам выступіў Дэпартамент выканання пакаранняў МУС. Ажыццяўляецца ён сумесна з Беларускай праваслаўнай царквой. «Звязда» распытала арганізатараў і ўдзельнікаў праекта пра тое, як праходзіць яго рэалізацыя, у чым яго мэта і асаблівасці.**

СТАР. 8–9



Будзь у курсе

## НАША ЛІЧБАВАЕ АСЯРОДДЗЕ

Якія мабільныя дадаткі не перашкодзіць спампаваць на тэлефон



**Кажуць, сучасны чалавек «жыве ў сваім смартфоне». «Толькі прачнуўся, ужо хапае тэлефон!» — бурчаць бабулі на дзяцей і ўнукаў. Сапраўды, з раніцы перш за ўсё мы цягнемся да гаджэтаў. У прынцыпе, сёння з іх дапамогай можна жыць актыўным жыццём, наогул не выходзячы з дому (і нават не ўстаючы з канапы) — даведвацца аб навінах і мець зносіны, купляць тавары і заказваць паслугі, атрымліваць і траціць грошы, працаваць і адпачываць.**

СТАР. 4